больш важна і трэба даць ясны адказ на пытаньне: хто і як можа даць праўдзівы голас ад нашай зямлі?

Усе дэмакратычныя кірункі, а тым болей — сацыялістычныя ў сваіх праграмах стаўляюць на першым месцы пункт, што кожын народ і кожын край мае права сам разьвязаць пытаньне аб сваім быце, аб сваей далейшай будучыні. Але ўсё гэта была толькі тэорыя, і мы ня бачылі рэальнага стасаваньня яе ў жыцьці. З гэтай прычыны ў людзкіх галовах узьнімалася вялікая блутаніна, і нават тыя, хто памянёнае права народаў і краёў прызнаў у тэорыі, ня ўмелі знайсьці спосабу правясьці яго ў жыцьцё.

Першы крок да правядзеньня тэорыі ў жыцьцё зрабіла на нашых вачах Украіна: як мы ўжо пісалі ў апошнім нумары „Гомана“, паводлуг весткі зь Вены, нацыянальны канвэнт Украіны пастанавіў сазваць у Кіеве на 1 мая старога стылю ўстаноўчы сэйм, каторы павінен аб'явіць Украіну незалежнай рэспублікай. Судзячы паводлуг тэй жа весткі, украінскі ўстаноўчы сэйм зусім ня будзе аглядацца на агульнарасейскі тымчасовы ўрад і ўстаноўчы сэйм, які нет ведама калі мае быць склікан. Болей таго: кіеўскі канвэнт ня годзіцца на тое, каб фэдэрацыйны лад у Расеі заводзіў агульнарасейскі сэйм. І гэта — зусім справядліва: калі Расея мае станавіць у будучыні вольны саюз вольных краёў і народаў, дык трэба забыцца аб тым, што краі і народы Расеі калісь гвалтам былі зьвязаны ў адну дзяржаву, трэба даць кожнай некалі незалежнай часьці гасударства магчымасьць вярнуць утрачаную волю, і толькі тады яны, калі гэтага будзе вымагаць іх палітычны і эканамічна–гаспадарчы інтарэс, могуць зьвязацца нанова „з вольнай і непрымушонай волі“. Іначай нават пастанова рэвалюцыйнага агульнарасейскага ўстаноўчага сэйму аб фэдэрацыі будзе аснована на *прынуцы*.

Каб пачуць сапраўдны голас нашай бацькаўшчыны, трэба даць магчымасьць жыхаром яе ясна высказаць сваю волю. А прыклад Украіны ясна кажа нам, як гэта зрабіць. І тады стануць лішнімі і непатрэбнымі як фальшывая статыстыка нацыянальнасьцей[1], так і прымушаньне голадам на зямлі пад страхам пекла па сьмерці да таго, каб нашы беларусы запісваліся ў палякі[2], стануць непатрэбнымі акты здрады Краю, як знамяніты „адрас“ да польскай дзяржаўнай рады, каб яна ўчыніла крокі дзеля прылучэньня Беларусі і Літвы да Польскага Каралеўства...

Ворагі нашага Краю гэта разумеюць. Але яны разумеюць яшчэ і другое: тое, што сам Край сябе нікому запрадаваць у няволю ня хоча. Вось яны і выступаюць проці ядынага рацыянальнага спосабу выявіць волю жыхароў нашай зямлі, яны вядуць брудныя, ганебныя інтрыгі, яны стараюцца аслабляць краёвыя сілы, каб пасьля абясьсілеўшы і разрозьнены Край лягчэй было паняволіць.

Толькі ж гэтыя паны забываюцца аб адным: што ўсякая мера цярпеньня народу раней ці пазьней канчаецца, — і лёс здрайцаў вядомы...

## Мэты вайны

Дня 15 мая ўсе ждалі зь вялікай нецярплівасьцю і зь вялікімі надзеямі: у гэты дзень імпэрскі канцлер павінен быў зрабіць сваю заяву аб ваенных мэтах Нямеччыны. Аднак надзеі споўніліся толькі часьцю: канцлер заявіў, што ён ня можа яшчэ адкрыта гаварыць аб сваіх ваенных мэтах, і высказаў адно толькі агульны пагляд на ваеннае палажэньне.

Але і з тых агульных слоў, якія мы чулі ад канцлера, прыраўнаваўшы іх да заявы галавы нямецкіх сацыял–дэмакратаў, Шэйдэмана, можна ўжо цяпер зрабіць некаторыя вывады. Мы можам зусім сьмела сказаць, што канцлер лічыць немагчымым, каб пасьля вайны Нямеччына вярнулася да сваіх старых граніц. Як і на якіх асновах мае адбыцца перамена граніц Нямецкай дзяржавы, гэтага канцлер не сказаў: ён гаварыў толькі, што Нямеччына ня хоча зьнішчэньня жыцьцёвых сіл Расеі. Затое Шэйдэман, цьвёрда выступаючы

проці захвату чужых зямель, падаў праект пашырэньня граніц Нямеччыны без анэксіі: ён гаварыў аб „перастаноўцы гранічных каменьняў на моцы ўзаемнай угоды“ між ваюючымі дзяржавамі, адзначываючы, што гэта — „не анэксія, а толькі ўпарадкаваньне граніц“.

Углядаючыся на тое, што найвялікшыя абшары заваёваны нямецкім аружжам ад Расеі, мы можам зрабіць яшчэ адзін вывад. Прынімаючы пад увагу, што справа этнаграфічна польскіх зямель ужо разьвязана актам 5 лістапада 1916 году, паводлуг каторага Польшчы даецца незалежнасьць, і што Расея той акт прызнала за правамочны, гутарка між Нямеччынай і Расеяй можа ісьці цяпер толькі аб Курляндыі, Літве і часьці Беларусі, якія ўходзяць у межы ўпраўленьня Обэр–Ост[1]. І тут адкрываецца шырокі прастор для ўсялякіх дагадак. Чы ўвесь гэты абшар Нямеччына хоча далучыць да сябе, чы толькі часьць яго — напрыклад, Курляндыю чы Літву? Чы край гэты мае станавіць асобную дзяржаўную арганізацыю — самабытную, або ў агульнанямецкім гасударственым саюзе, чы мо войдзе ў склад суседніх Прусаў? Чы, урэшце, часьць яго можа быць аддадзена назад Расеі і на якіх умовах? На ўсе гэтыя пытаньні мы ня толькі ня маем адказу, але і намёку на разьвязку іх. Адказ на іх дасьць далейшы ход вайны.

## Вільня, 15 чэрвеня

Нацыяналізм — гэта твор буржуазіі і капіталістычнага ладу. На грунце эканамічнай канкурэнцыі між капіталістамі розных нацыянальнасьцей і краёў вырастае дзікая ідэалёгія нянавісьці між людзьмі, каторыя гавораць рознымі мовамі, і яна агартае шырокія кругі буржуазіі, захоплівае цёмныя народныя масы і паднімае старонку проці старонкі, у страшэнных войнах марнуючы жыцьцё мільёнаў людзей і вякамі зьбіраныя здабыткі народаў — духовыя і матэрыяльныя...

Супроць нацыяналізму найбольш ярка, найбольш энэргічна выступае сьвядомая дэмакратыя ўсіх народаў, выступаюць арганізованыя работніцкія масы. І пад той час, як у нашай старонцы буржуазія розных нацыянальнасьцей вядзе між сабой барацьбу аб тое, хто мае панаваць над народнымі масамі краю, сьвядомыя дэмакратычныя элемэнты шукаюць узаемнага зблiжэньня, стараюцца злучыць чынныя сілы паадзінокіх нацыянальных работніцкіх груп, каб на сваей зямлі дабыць волю для ўсіх гаротнікаў, — усіх, хто працай крывавай здабывае свой кусок хлеба.

Выступленьне польскага грамадзянства, аб каторым мы ўжо пісалі ў тым нумары „Гомана“ (мэмарыял да нямецкага канцлера аб патрэбе прылучыць наш край да Польшчы)[1], — гэта тыповае буржуазнае выступленьне, якое мае на мэце толькі карысьць тутэйшага польскага панства. Дый іначай быць не магло: вядома, што польскіх народных мас, на каторыя пазываецца мэмарыял, у нашым краі няма, бо ж ня можам лічыць за палякаў тых несьвядомых беларускіх сялян, якіх польскія ксяндзы–нацыяналісты сілай сваей духоўнай павагі прымусілі запісвацца „ў палякі“. А гэтыя „робленыя“ палякі — такія цёмныя, што яны зусім ня могуць зразумець, якія цяжары суліць ім „еднасьць“ з Польшчай, утрыманьне польскага караля, яго двара ды цэлых хмар польскіх чыноўнікаў, каторыя залілі б наш край гэтаксама, як калісь залівалі яго маскоўскія. Але мала таго, што выступленьне палякаў — шкоднае для тутэйшых народных мас: яно становіць новы грунт дзеля абастрэньня нацыянальных сварак на нашай зямлі, каторыя нішчаць дарэмна краёвыя сілы, гэтак патрэбныя дзеля ўнутранай творчай работы...

Шчыра дэмакратычныя элемэнты краю нашага — беларускія, літоўскія і жыдоўскія — павінны новай праяве нацыяналізму даць цьвёрды адпор. Але адпор гэты павінен выявіцца не ў нападках на палякаў наагул, а ў цясьнейшым яднаньні дэмакратычных сіл, у адкрываньні несьвядомым народным масам вачэй на іх палажэньне і на тую дарогу, якая вядзе да праўдзівай волі.